УДК 398.3/.4:94(476)

**Н. А. Гулак,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ПАВЕР'І АБ ПРАДВЕСНІКАХ ВОЙН І САЦЫЯЛЬНЫХ КАТАКЛІЗМАЎ

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны маладаследаванай у беларускай фальклярыстыцы тэме – прафетычным і эсхаталагічным павер'ям, якія ўваходзяць у комплекс так званай народнай герменеўтычнай прозы. Даказана, што траўматычны вопыт, перажыты або засвоены носьбітамі традыцыі, выражаецца ў развітой сістэме павер'яў аб «знаках бяды» – прыродных і культурных прадвесніках сацыяльных катастроф, якія рэпрадукуюцца ў калектыўнай памяці. Абазначаны толькі некаторыя з'явы народнай традыцыі, звязаныя з драматычнымі падзеямі гісторыі Беларусі першай паловы XX ст.

**Ключавыя словы:** фальклор, вайна, міфасемантыка, прафетычныя павер'і, народная эсхаталогія.

**N. Gulak,**
*PhD in Philology, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Direction of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

# BELARUSIAN FOLK BELIEFS ABOUT THE HARBINGERS OF WARS AND SOCIAL CATACLYSMS

**Abstract.** The article is devoted to a topic little studied in Belarusian folklore – prophetic and eschatological beliefs, which are part of the complex of the so-called folk hermeneutic prose. It has been proven that the traumatic experience learned by the bearers of the tradition is expressed in a developed system of ideas about "signs of trouble" – natural and cultural harbingers of social catastrophes, reproduced in collective memory. The article identifies only some phenomena of folklore tradition associated with dramatic events in the history of Belarus in the first half of the twentieth century.

**Keywords:** folklore, war, mythosemantics, prophetic beliefs, folk eschatology.

Найбольш раннія згадкі народных уяўленняў аб прадвесніках войнаў і сацыяльных катаклізмаў, відавочна, належаць ле-

тапіснай гісторыі. Акрамя няказкавай прозы, сюжэты, заснаваныя на падобных рэлігійна-містычных вераваннях, адлюстраваны ў помніках старажытнага пісьменства і царкоўнай літаратуры. Напрыклад, аўтар «Слова пра паход Ігараў» у пралогу эпічнай карціны няўдалага паходу паўднёварускіх князёў на чале з Ігарам Святаславічам супраць полаўцаў у 1185 г. дае вобраз зацьмення сонца (1 (5) мая 1185 г.). Вуснамі князя Ігара аўтар прaракае і трактуе гэту прыродную з'яву як знак вайсковага паражэння. У помніку гарадскога летапісання Беларусі XVII–XIX стст. Магілёўскай хронікі Сурты і Трубніцкіх неаднаразова адлюстроўваюцца звесткі аб нябесных «знаках бяды»: «У гэтым жа годзе (год 1681. – *Н. Г.*) на рымскае Божае Нараджэнне з'явілася з зоркі страшна вялікая камета, якая ўсяму свету была бачна, і відна яна была некалькі тыдняў. Праз год пасля гэтага ў Маскве пасеклі самых знакамітых баяраў <…>» [8, с. 299]; «(год 1704. – *Н. Г.*) На святога Іллю, гэта значыць 20 ліпеня, у вячэрні час, як гналася быдла, паказалася на небе камета, з'явілася з малой зоркі, а потым, павялічыўшыся, вяла свой хвост на поўнач, і страшна гэта было. У гэты час, увечары, былі адслужаны ў цэрквах усеагульныя малебны <…>» [8, с. 337]. Падкрэслім значэнне каметы 1811 г., якая сваёй велічынёй і працягласцю знаходжання ў дасяжнасці чалавечага зроку ўразіла сучаснікаў і пакінула значны след у гісторыі і мастацкай літаратуры, прычым не толькі як прадвеснік вайны 1812 г. (Great Comet of 1811) [6, с. 89–92].

Пагодзімся з даследчыкамі, якія лічаць, што прафетычныя ўяўленні і павер'і рэпрадукуюцца ў фальклоры дзякуючы такой асаблівасці калектыўнай памяці традыцыйнага грамадства, як цыклічнасць. Яна абумоўлена вопытам пражывання «пастаяннага чаргавання перыядаў дабрабыту і бедстваў» [9, с. 218]. Маюцца на ўвазе найперш выкліканыя неўраджаямі так званыя «галодныя гады»: у XIX ст. у розных губернях Расійскай імперыі неўраджаі і выкліканы імі масавы голад сялянства паўтараліся кожныя 6–7 гадоў, працягваючыся па два гады запар. Асабліва цяжкімі былі перыяды голаду, выкліканыя неўраджаямі 1873, 1880, 1883 і 1891–1892 гг. [4, с. 103–104]. Бедствамі таксама з'яўляліся эпідэміі халеры, эпізаотыі сібірскай язвы і чумы буйной рагатай жывёлы. Гэта асэнсоўвалася ў народных павер'ях, паводле якіх высокая ўрадлівасць у цяпераш-

нім павінна быць кампенсавана ў будучым надзвычайнай стратнасцю (смерцю/нястачай/голадам). У такім ракурсе паводле логікі традыцыі людзі трактавалі *вялікія ўраджаі збожжавых, з'яўленне каласоў-спарышоў, нараджэнне вялікай колькасці хлопчыкаў* і інш.

У XIX–XX стст. аповеды аб прадвесніках сацыяльных катастроф, прышэсці Антыхрыста суадносіліся з вайной 1812 г. («вайной з французам»). Напрыклад, у камедыі Янкі Купалы «Паўлінка» (1912) у вусны прадстаўнікоў засцянковай шляхты Пранцыся і Агаты Пустарэвічаў аўтарам укладзена народнаэсхаталагічнае апісанне: «*Кажуць, француз, пане дабрудзею, ідзе на Барысава па шапку і рукавіцы, што калісь там заставіў. Чатырыста тысяч войска з сабой вядзе <…> Спранжыновы касцёл з сабой нясе <…> не нясе, а на паветры, на машыне, што лётаюць, гэты касцёл вязе*». Дадзенае ў камедыйным стылі, яно ў пэўным сэнсе захавала вобразнасць народных аповедаў аб знаках бедстваў. Гэта ўказанне на глабальнасць катастрофы і акцэнт на выяве хрысціянскага вобраза-сімвала ў нябеснай (сакральнай) сферы (параўн.: выявы на небе крыжоў, Багародзіцы і інш.).

У эсхаталагічным ракурсе народам асэнсоўваліся Першая сусветная вайна («вайна з германцам»), калектывізацыя, масавы голад 1932–1933 і 1946–1947 гг., шырокамаштабныя антырэлігійныя кампаніі 1927–1928 і 1958–1961 гг., Вялікая Айчынная вайна і інш. Адзначым, што ў даследаваннях сферы традыцыі, якая вызначаецца як народная эсхаталогія, перыяд 1920–1930-х гг. трактуецца як «апакаліптычны ўсплёск» або «эсхаталагічны крызіс». «Выкліканы сацыяльным напружаннем і ўзрушэннямі рэвалюцыйнай эпохі, гэты феномен назіраўся ў тых групах, якія гэтыя змены закранулі ў найбольшай ступені» [10, p. 74]. Апошняя хваля актывізацыі народных прафетычных рэлігійна-містычных павер'яў і практык назіралася ў 1949–1950 гг., калі «пашырыліся так званыя "святыя пісьмы", шматлікія прароцтвы аб канцы свету, "чуткі рэлігійнага зместу", але, галоўнае, народ чакаў новай вайны» [2, с. 234].

Фальклорныя наратывы аб «знаках бяды» і «апошніх часах» маюць развітую генеалогію і ўласны матыўна-сюжэтны фонд, які ўказвае на іх арганічную ўлучанасць ва ўсходнеславянскую вусную традыцыю. У народнай свядомасці менавіта пачатак

вайны ў большай ступені, чым яе заканчэнне, трактаваўся як сакралізаваная храналагічная мяжа. У адрозненне ад свят і прысвяткаў – храналагічных меж гадавога цыкла, якія ўстойліва маркіруюць пасты, сацыяльна-культурныя і гаспадарчыя перыяды, цыклы вегетацыі і інш., прадвеснікі вайны маюць прагнастычны характар. Эфектыўнасць прадвеснікаў рэалізуецца, як правіла, пастфактум, праз своеасаблівы зваротны працэс іх аб'ектывацыі: толькі пасля вайны ці перажытага няшчасця ўсё, што ў той ці іншай ступені раней выходзіла за межы нормы, ва ўспамінах і інтэрпрэтацыях носьбітаў пачынае трактавацца як прадвеснік няшчасця [5, с. 20]. Гэтым тлумачыцца і шырокі, практычна адкрыты рэестр «знакаў бяды» ў беларускім фальклоры, што, праўда, не адмаўляе наяўнасці ўстойлівай міфасемантычнай структуры і сістэмы вобразаў, якія складаюць змястоўную аснову падобных павер'яў.

Так, пачатак і канец вайны ў свядомасці народа часта ўвасаблялі нябесныя знакі (змяненне сонца, каметы, слупы, крыжы, стрэлы, невядомыя зоркі, вясёлка, антрапаморфныя і заморфныя выявы ў небе). У наш час асобныя факты гэтай традыцыі запісаў У. Лобач ад тых сведак пачатку вайны, якія ў 1941 г. былі дзецьмі: «Дзіва ж было. Неба было цёмнае, як туча, і краснае, як кроў. Было неба гэткае каля сонца. А сонца разбяжыцца на чатыры частачкі абакнавенна, на чатыры частачкі накрыж, і апяць збяжыцца ўместа. І во гэтак з час можа глядзелі, дужа доўга стаялі. Тады гэдак казалі, што перад вайной. І, мусіць, у той год ці вайна і не началася» [7, с. 90]. Інфарманты паведамляюць, што напярэдадні вайны многія людзі наяве і ў сне бачылі незвычайныя прыродныя з'явы (пунсовыя каметы, чырвонае зарыва або слуп у небе), якія ўспрымаліся як прадвесце бяды. «Зарыва магло трансфармавацца ў чырвоную карову з доўгім языком, вогненнага вершніка, крыж або чатыры крыжы (па ліку гадоў вайны), аблічча Багародзіцы» [2, с. 235].

Аб немінучай вайне народу гаварылі прадказанні праведных людзей, з'яўленне святых, прарочыя сны, адкрыццё калодзежаў, міраструменне («плач») абразоў, абнаўленне абразоў, прыдарожных крыжоў [4]. Абнаўленне абразоў выражаецца ў раптоўным прасвятленні або трансфармацыі выяў на абразах і служыць прычынай узмацнення іх сакралізацыі, шанавання іх як цудатворных. Гэтаму феномену, хвалі якога да сярэдзіны

XX ст. назіраліся ў Беларусі, Украіне, Расіі, Малдове, Польшчы, прысвечаны шэраг публікацый І. Бутава, В. Касцюка, В. Валожынай.

У народнай свядомасці вайна трактавалася як непазбежнае пакаранне за зруйнаванне ў гады барацьбы з рэлігіяй будынкаў і аб'ектаў хрысціянскага культу, апаганьванне святых месцаў і збядненне сакральна-рэлігійнай сферы жыцця (згадаем аповесць В. Быкава «Знак бяды», 1982). У час Вялікай Айчыннай вайны актуалізаваліся аповеды на своеасаблівы эсхаталагічны вандроўны сюжэт «сустрэча на дарозе». Персаніфікацыямі веснікаў ці пасланнікаў іншасвету, якія прадракаюць вайну, у гэтым і іншых сюжэтах маглі выступаць голая жанчына, якая просіць купіць ёй адзенне, жанчына ў белым/чырвоным, стары, воўк і інш. [1, с. 234].

У якасці абагульнення адзначым, што экстрэмальныя пагрозы войнаў і сацыяльных катаклізмаў выклікалі ў традыцыйным грамадстве ўзмацненне чаканняў катастрофы і высокую ступень напружання. Гэта абумоўлівала ўключэнне «ахоўных механізмаў» народнай традыцыі, што ў побытавай культуры насельніцтва Беларусі выражалася ў пашырэнні магічна-засцерагальных практык, разнастайных форм прафетычнай, эсхаталагічнай народнай прозы.

1. *Астрейко, М.* Обновление икон на территории Беларуси во время Великой Отечественной войны [Электронный ресурс] / М. Астрейко, А. Подгорный, И. Бутов // Уфоком. – Режим доступа: https://www.ufo-com.net/publications/art-8494-obnovlenie-ikon-vo-vremia-velikoi-otechest vennoi-voiny.html. – Дата доступа: 11.04.2023.

2. *Балашова, А. Ф.* Коммуникативная природа народных рассказов на примере текстов о Великой Отечественной войне в небесных знамениях / А. Ф. Балашова // Коммуникат. исслед. – 2014. – № 1. – С. 233–240.

3. *Бутов, И. С.* Ареал чудес: волны обновлений икон в XIX – первой половине XX века / И. С. Бутов. – Минск : Колорград, 2018. – 186 с.

4. Голод // Энциклопедический словарь. Том IX. Гоа – Гравер. – СПб., 1893. – С. 102–104.

5. *Добровольская, В. Е.* «Все знали, что война будет…» / В. Е. Добровольская // Живая старина. – 2010. – № 2. – С. 18–21.

6. *Лаўрэш, Л.* След вялікай каметы 1811 г. у сусветнай культуры / Л. Лаўрэш // Роднае слова. – 2011. – № 10. – С. 88–92.

7. *Лобач, У. А.* 1941 год вачыма дзяцей і падлеткаў Віцебшчыны: антрапалагічны дыскурс ваеннай гісторыі / У. А. Лобач // Вестн. Полоцк. гос. ун-та. Серия А. – 2020. – № 9. – С. 88–97.

8. Магілёўская хроніка Трафіма Сурты і Юрыя Трубніцкага / пер. з пол. і камент. В. Таранеўскага // Беларускія летапісы і хронікі / уклад. У. Арлова. – Мінск, 1997. – С. 281–390.

9. *Рыблова, М. А.* Народные образы предвестников Великой Отечественной войны: опыт систематизации и дешифровки / М. А. Рыблова // Вестн. Томск. гос. ун-та. – 2022. – № 474. – С. 217–227.

10. *Viola, L.* The Peasant Nightmare: Visions of Apocalypse in the Soviet Countryside / L. Viola // The Journal of Modern History. – 1990. – Vol. 62, iss. 4. – P. 747–770.

УДК: 75.047(510)

**Дин Шутин,**
*соискатель ученой степени кандидата искусствоведения учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

## ХУДОЖЕСТВЕННОЕ ВОПЛОЩЕНИЕ РИТМА В КИТАЙСКОЙ ПЕЙЗАЖНОЙ ЖИВОПИСИ

**Аннотация.** Китайская пейзажная живопись имеет долгую историю и богатые традиции. В пейзажной живописи от художника требуются высокая концентрация и умение пользоваться приемами обобщения природы, овладение ритмом изображаемых объектов с целью создания более поэтичного идеального искусства. Художественное воплощение ритма реализуется на полотне через работу с кистью, выбор ее положения, толщину, длину, цвет линий, их плотность, что позволяет сохранять гармонию и единство частей целого.

**Ключевые слова:** Китай, пейзажная живопись, кисть, композиция, линия, ритм, цвет.

**Ding Shuting,**
*Applicant for the degree of Candidate of Art History of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

## ARTISTIC EMBODIMENT OF RHYTHM IN CHINESE LANDSCAPE PAINTING

**Abstract.** Chinese landscape painting has a long history and rich traditions. In landscape painting, creativity requires from the artist a high